**УДК 39**

# АСАБЛІВАСЦІ КАЛЯНДАРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ УШАНАВАННЯ ПРОДКАЎ У БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

***А. С. ЦЫГАНКОВА***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Падзвінне з'яўляецца адным з шасці гісторыка-культурных рэгіенаў Беларусі, кожны з якіх мае сваю спецыфіку ў пахавальна-памінальнай абраднасці. Продкі жыхароў Падзвіння, як і наогул усіх беларусаў, верылі ў бясконцы кругаварот жыцця, дзе смерць увасаблялася як кропка пераходу з аднаго этапа ў іншы. Адсюль вялікая колькасць рытуалаў і абрадаў, якія суправаджаюць гэты пераход. У артыкуле разгледжан адзін з самых устойлівых і кансерватыўных элементаў каляндарнай абраднасці – памінальна-пахавальная традыцыя.*

***Ключавыя словы**: памінальна-пахавальная традыцыя, восеньскія дзяды, Маслянічныя дзяды, Траецкія дзяды, Стаўроўскія дзяды, Радаўніцкія дзяды.*

Смерць – гэта адна з самых таямнічых і загадкавых з'яў у традыцыйнай культуры, якая ўсяляе ў чалавека страх і прымушае прытрымлівацца ўсталяваных законаў і норм паводзін. Таму даследчыкі адзначаюць захаванне шматлікіх старажытных элементаў у пахавальна-памінальнай абраднасці на сучасным этапе [6, с. 376].

У структуры памінальнай абраднасці выдзяляюць "прыватныя" (індывідуальныя) памінальныя дні і агульныя. Першыя, звязаныя з памінаннем канкрэтнай асобы на працягу года з дня смерці, і застаюцца ў межах пахавальнага абраду. Другія, агульныя, памінкі прысвечаны памінанню ўсіх памерлых продкаў і ўключаны ў структуру каляндарнай абраднасці [4, с. 204]. У цыкле народнага календара беларусаў Падзвіння асобае месца займаюць абрады ўшанавання памерлых продкаў – Дзяды, якія распаўсюджаны толькі ў беларусаў і часткова ўкраінцаў [3, с. 37]. Найбольшы распаўсюд на Падзвінні атрымалі: восеньскія (Дзмітраўскія), Масленічныя, Радаўніцкія і Траецкія Дзяды. *"Ну, памінаюць абычна вот вясной. После Пасхі чэраз нядзелю Радаўніца, гэта абязацельна, як мы, прыдержываемся і перад Троіцай. […] І ў акцябарскія, у начале наябра Дзяды"* (Міерскі р-н)[8].

**Восеньскія дзяды**. На Падзвінні гэты памінальны дзень называюць "Асяніны", "Змітраўка", "Дзмітраўскія" або "Восеньскія" Дзяды, існуе нават назва "Вялікія Дзяды", якая сустракаецца на Дзісеншчыне. Абрад пашыраны па ўсей тэрыторыі Падзвіння сярод беларускага праваслаўнага насельніцтва. Інфарманты адзначаюць, што Восеньскія дзяды на Падзвінні з'яўляюцца адным з асноўных абрадаў ушанавання памерлых продкаў: *"Асяніны гэта дужа даўныя, гэтыя дзядоўскія, прадзеды ўжо гэта спраўлялі, і цяпер спраўляюць гэты Дзяды. Яны дужа бальшыя Дзяды, самые глаўные"* (Докшыцкі р-н) [3, с. 38].

Беларусы вераць, што на Дзяды душы памерлых продкаў прыходзяць да сваіх нашчадкаў. Лічыцца, што іх трэба добра сустрэць і пачаставаць, каб яны спрыялі ў жыццёвых справах сям'і: *"Этім праздненством жівые годзюць нябожчыкам, которые су святымі однычіваюць і ім (жывым) хлеба-салі пасылаюць"* [9, с. 296]. Памінальная вячэра на восеньскія Дзяды пачынаецца з малітвы і рытуальнага запрашэння памерлых продкаў на трапезу:*"Дзядочкі-бабачкі, хадзіце к нам абедаць, старыя і малыя, хадзіце к нам абедаць, у каго не к каму ісці, не к чаму – усе ідзіце к этаму столу. Самі ідзіце, малых вядзіце, а хто хадзіць не ўмее, самі нясіце"* (Барысаўскі р-н) [10, с. 223]. Каб задобрыць і дагадзіць душам памерлых, рыхтавалі вялікую колькасць, звычайна называюць ад 9 да 17, памінальных страў. Як адзначаў М. Нікіфароўскі, *"число "варь" завісіть от матеріального достатка семы, а потому іх может быть і больше і меньше. Важно то, чтобы варі былі ні ў цотку, а ў лішку. Это делается в укорізну ненасытнай смерті, которая імела "повную цотку жертв", но захотела новой, которая оказалась лішней"* (повсем. по Вітеб. губ.) [9, с. 296].

У рэгіене пад "дзядамі" разумелі ўсіх памерлых продкаў, незалежна ад іх полу і ўзросту. На Падзвінні памінанне продкаў на Дзяды адбывалася звычайна ў адзін дзень, у адрозненне ад іншых рэгіенаў, дзе фіксуюцца памінанні ў два ці нават у тры дні [3, с. 38]. У рэгіене фіксуюцца звычаі адкладаць памерлым продкам ежу ў асобную талерку: *"Кладзем, да-да, малая тарэлачка і каждага блюда, што толька строіш, усе адкладываіш. І дажэ і чарачкі ўліеш туды"* (Докшыцкі р-н) [3, с. 40]. Абрадавая вячэра патрабуе дысцыпліны і выконванне пэўных абавязкаў. Так, на Лепельшчыне, пасля спажывання ежы, лыжкі трэба класці на стол асаблівым спосабам: *"І ложкі на Дзяды ні так клалі. Так*

[8]ФА ПДУ: зап.У. Аўсейчыкам, М. Мякшылай, А. Цыганковай, А. Апанасенкам у 2019 г. ад Вароны Фаіны Владіміровны, 1938 г. н. у в. Папшулі Мерскага р-на.

*кладзеш выемкай уверх, а то ўніз на Дзяды нада. І ясі так: зачарпнуў адзін раз, у рот узяў, а тады палажы ўніз выемкай"* [3, с. 41]. У Чашніцкім раёне былі распаўсюджаны іншыя ўяўленні, згодна з якімі лыжку клалі наадварот: "*Ясі і ложку кладзеш. Тата гавораць: "Ложку кладзі дагары. Той выемкай што ясі. Каб яна ляжала кверху. Каб дзяды маглі з'есці". Такія былі законы"* [3, с. 41]. На Бешанковіччыне існаваў такі ж парадак, але тлумачэнне было іншым: *"Ложкі не кладуць ніц, а дагары, бо пакойнік ляжыць не ніц, а дагары"* [3, с. 41]. Восеньскія Дзяды дэманструюць асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці рэгіена, але маюць шмат лакальных варыянтаў.

**Маслянічныя дзяды.** Напярэдадні Масленіцы ў суботу зафіксавана традыцыя спраўляць "Дзяды", яны маюць назву "Мясніцы", "Масленічныя", "Мясаедныя" Дзяды. Гэтая памінальная традыцыя распаўсюджана на Падзвінні (менавіта ва ўсходняй і цэнтральнай частках рэгіена, а таксама на Докшыччыне), Падняпроўі і Усходнім Палессі [5, с. 327]. Святкаванне Дзядоў на Падзвінні не мае прынцыповых адрозненняў ад іншых Дзядоў, але спецыфічнай рысай рэгіена з'яўляецца прыгатаванне для памінальнай трапезы бліноў: "*Адзначалі Масляныя Дзяды – гатавалі ўсе масляное*" (Чашніцкі р-н [5, с. 328]. Масленічныя Дзяды на Паазер'я праходзяць больш сціпла ў параўнанне, напрыклад, з Траецкімі [6, с. 65].

Прыкметы звязаныя з Масленічным тыднем могуць адрозніваецца ад прыкмет, прымеркаваных непасрэдна да Маслянічных Дзядоў. Так, напрыклад, па дадзеных Н.Я. Нікіфароўскага, на масляныя Запусты[9] ўсе члены сям'і павінны былі кідаць ложку пад стол. Гэтая дзея павінна была вызначыць будучы лес чалавека: *"После ўжіна, на масляныя "запысты", не выходзя із-за стала, семьяне бросають свої ложкі под стол, чья ложка ўпадет перевернутою і головой к "куту", тот не дождется тех-же "запыстов" будущего года"* [9, с. 239]. На Мясныя Дзяды таксама бытавала прыкмета звязаная з рэччу, што ўпала са стала, але яна не прадвяшчала нічога трагічнага: *"Всякій с'едобный кусочек, ложка і ножь, упавшіе со стола в "місоедныі дяды" за ўжіном, не пророчать дому чьей-нібудь смерті, а только ўказывають, что отсутствуюўій родной ілі блізкій человек, а также одін із дядов в данное время нуждается в упавшем предмете. В этіх відах упавшій предмет остается на полу до другого дня"* [9, с. 297].

Адметнай рысай паўночна-ўсходняй тэрыторыі Падзвіння з'яўляюцца архаічныя пахавальна-памінальныя гульні, прымеркаваныя да сустрэчы і провадаў Масленіцы. Пахаванне "дзеда" ("Дзед касцей падавіўся") і "бабы" ("Баба сырніцай падавілася") зафіксаваны ў Гарадоцкім, Шумілінскім, Лезненскім, усходняй частцы Полацкага раенаў [7, с. 158]. Пахавальныя гульні маюць язычніцкія карані (ахвярапрынашэнне і смерць выклікаюць імпульс аднаўлення і новага жыцця) [6, с. 68], але на сенняшні дзень яны страцілі першапачатковае значэнне і захаваліся ў выглядзе гульні ды забавы.

**Радаўніцкія дзяды.** Радаўніца – язычніцкае веснавое свята, звязанае з культам продкаў, дзень памінання памерлых, адзначалася ў аўторак на Фаміным тыдні[10]. *"Панядзельнік – жывая Радаўніца, а ва вторнік – мёртвая. В панядзельнік гэта вон там саджаюць ва гародзе – гэта жывая Радаўніца. А ва вторнік – гэта ўжо мертвая Радаўніца. Тады ўжо ходзяць на кладбішча"* (Шумілінскі р-н) [10, с.205]. На Радаўніцу кожная сям'я ішла памінаць родзічаў спачатку ў царкву, а потым на могілкі, дзе адбывалася памінальная трапеза, частку абрадавых страў (бліны, яйкі, сыр, куцця і інш.) і гарэлкі пакідалі "для мертвых". Але трэба адзначыць, што памінальная трапеза на могілках адбываецца не паўсюдна, звесткі пра яе запісаны ў Лезненскім і Дубровіцкім раенах, але практычна не сустракаецца ў заходніх раенах Падзвіння (Мерскім, Шаркаўшчынскім, Пастаўскім раёнах). На Радаўніцу зафіксавана традыцыя несці на могілку велікодныя яйкі: *"А на Радаўніцу прыходзяць [на могілкі], запальваюць свечку, молюцца, яйко ложуць, булку [...]"* [6, с. 100]. Семантыка чырвонага яйка ў абрадах і звычаях узыходзіць да старажытных вераванняў, якія ўласцівы многім народам, бо ўвасабляе адраджэнне жыцця і з'яўляецца важным апатрапейным сродкам.

На Падзвінне зафіксавана з'ява запрашаць дзядоў мыцца ў лазню: *"Дзядочкі, бабачкі, хадзіце к нам у баню"* (Барысаўскі р-н) [10, с. 224]. Лічылася, што *"на Дзяды, хто баньку гэту робіў – гэта жывым, каб здароўе было, а хто на тым свеце, каб пакой вечны атрымалі"* (Докшыцкі р-н) [10, с. 225]. У рэгіене такая асаблівасць характэрна для ўсіх Дзядоў, бо лазня ўвасаблялася як памежжа між "тым" і "гэтым" светам.

**Траецкія дзяды.** На Падзвінні распаўсюджанне атрымаў траецкі памінальна-абрадавы комплекс. У сучасны перыяд памінкі, прымеркаваныя да гэтага свята, пашыраюцца на тэрыторыю ўсей краіны, паколькі Тройца з'яўляецца афіцыйна дазволеным у праваслаўнай царкве днем памінання памерлых [1, с. 49]. Не гледзячы на гэта, траецкія Дзяды захавалі свой ранейшы арэал. Напрыклад, на Міншчыне гэты абрад амаль не фіксуецца, на Брэсцкім Палессе дадзеная традыцыя так сама не была пашырана. Амаль адсутнічае траецкае памінанне памерлых на Панямонні, а вось на Усходнім Палессі яны

[9]Апошні дзень масленічнага тыдня.

[10]У гэты тыдзень Царквою ўспамінаецца з'яўленне ўваскросшага Хрыста.

спарадычна сустракаюцца [1, с. 50]. Згодна з меркаваннем даследчыка А.Ю. Лозкі, Траецкія Дзяды атрымалі назву Духавая субота (Святы дух, Стаўрускія Дзяды, Стаўроўскія Дзяды, Сёмка) [8, с. 106].

Адным з асноўных абрадавых дзеянняў траецкіх святкаванняў з'яўляецца памінанне продкаў: *"Савята Тройца май стаўляць, старых памінаіць"* (Верхнядзвінскі р-н) [8, с. 106]. *"На Троіцу мы ідзем памінаць радзіцелей, носім закуску ўсякую, выпіўку. Прійзем, паплачаэм, потым паядзем, памянем усіх і раз'язжаемся. Далжна быць абязацельна куцця, бліны, яйцо […] Яйкі красілі бярозавым лісцем ілі травой […]"* (Гарадоцкі р-н) [6, с.110]. У Расонскі р-не зафіксавана, што*"на могілку пасцілалі скацерку, запальвалі свечку, маліліся Богу. І первым долгам нада ўзяць тры ложкі куцці і палажыць на могілку, а потым кожны, хто каля магілкі, даўжон па тры лыжкі куцці з'есць"* [6, с.109]. Наведванне могілак звычайна адбываецца ў сярэдзіне дня, гэты тлумачыць бытаванне прыказкі: *"Утрам пашуць, в абед плачуць, а к вечару ўжо скачуць. Гэта на Троіцу такое*" (Шумілінскі р-н) [10, с.205].

Атрыбутам траецкай абраднасці з'яўляецца зяляніна, "май". Як і паўсюдна на Беларусі, на Падзвінні ў Духоўскую суботу "маем" упрыгожвалі двары, хаты, магілы: *"Прыходзіш на кладбішча і хрэсціш бярозай магілку, і гэта бярозку ўторкваешь на могілку"* (Расонскі р-н) [1, с. 50]. У Полацкім раене "май" ставілі на ростаньках, каля крыжа [6, с.111]. У Лепельскім раене зафіксаван звычай, згодна з якім усе жанчыны збіраюцца перад Тройцай каб выткаць наметку для царквы: *"Што перад гэтай Тройцай робюць бабы. Вот намётку, такую намётку чэраз усю цэркву, нада выткаць яе за адзін дзень. І збіраюцца ўсе бабы, і што ў каго ёсь. […]Усе складуць гэта і называецца губка. Саснуюць, уцягваюць у бёрда і ткуць. Усе бабы збіраюцца. А што гэта? Гэта каб дзеці былі здаровыя. Гэта "ахвяра" завецца. Тады бацюшка прыязджаець, абедню робіць. І нясуць бабы гэтыя, і сцелюць раненька ў цэркві гэтую ахвяру. А так вот раненька хлеб пякуць, тады нясуць буханачку хлеба невялічкую. Сырок нясуць. Эта ўсё ахвяраюцца, яйкі нясуць"* (Сенненскі р-н) [10, с.281].

У цэнтральнай і паўднева-заходняй частках сучаснага Докшыцкага раена Віцебскай вобласці зафіксаваны абрад **Стаўроўскія Дзяды** [1, с. 48]. Есць некалькі версій аб часе правядзення абраду: субота перад Тройцы, напярэдадні свята Уздвіжанне і на Восеньскія Дзяды. Менавіта версія аб святкаванні Стаўроў перад Тройцай з'яўляецца найбольш распаўсюджанай у сучаснай беларускай этнаграфіі [2, с.117-118]. Стаўроўскія Дзяды (Стаўрускія Дзяды, Стаўры) святкуюцца досыць сціпла ў параўнанні, напрыклад, з Восеньскімі Дзядамі. На гэта ўплывае веснавы недахоп хлеба і ўвогуле харчавання. Некаторыя сяляне на пытанне, чаму яны на Стаўраў не запрашаюць сваіх "дзядоў", адказваюць: *"На што ш іх звацi, калі нечага даці"* [8, с. 109]. Цэнтральнае месца ў памінанне памерлых на Стаўроўскія Дзяды займае вячэра, якая адрозніваецца ад іншых памінальных вячэр. Дзед або бацька, нахіліўшыся так, каб твар яго быў на ўзроўні са стравамі, тры разы прагаворваў: *"Стаўры, Гаўры, гам, прыходзьце к нам!"* [1, с. 119; 8, с. 109].

Такім чынам, у структуры памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння выдзяляюць "прыватныя" (індывідуальныя) памінальныя дні і агульныя памінкі. Першыя, звязаныя з памінаннем канкрэтнай асобы на працягу года з дня смерці, і застаюцца ў межах працягу пахавальнага абраду. Традыцыйна на Падзвінні індывідуальныя памінкі ладзіліся на 3-ці, 6-ты, 9-ты, 20-ты, 40-вы дзень, у паўгода, а затым у гадавіну [4, с. 205]. Другія, агульныя памінкі прысвечаны памінанню ўсіх памерлых продкаў і ўключаны ў структуру каляндарнай абраднасці, гэта ўшанаванне памерлых продкаў у межах каляндарнага года займае важнае месца ў беларускай народнай культуры. Прычым сярод беларусаў праваслаўнага веравызнання пахавальна-памінальная традыцыя распаўсюджана значна больш і мае большую варыятыўнасць, чым тая ж традыцыя ў каталіцкага насельніцтва Падзвіння. Гэта можа быць звязаны з тым, што памінальная традыцыя трапіла пад моцны ўплыў каталіцкай царквы, распаўсюджаныя дні ўшанавання памерлых продкаў, былі выцеснены "афіцыйнымі" памінальнымі абрадамі, прымеркаванымі да Дня Задушнага [1, с. 44]. У цыкле народнага календара беларусаў Падзвіння асобае месца займаюць абрады ўшанавання памерлых продкаў – Дзяды, гэта памінальная традыцыя зафіксанава толькі ў беларусаў і часткова ўкраінцаў. Як адзначаюць даследчыкі, найбольшы распаўсюд на Падзвінні атрымалі: восеньскія (Дзмітраўскія), Масленічныя, Радаўніцкія і Траецкія Дзяды. Памінальна-пахавальная традыцыя – адна з самых кансерватыўных і ўстойлівых элементаў каляндарнай абраднасці, якая захавала шмат старажытных рысаў, напрыклад, уяўленні пра смерць і жыцце на "тым" свеце, розныя прадпісанні і забароны, прыкметы і павер'і, якія з'яўляюцца адметнымі рысамі Беларускага Падзвіння, але памінальныя элементы каляндарнай абраднасці рэгіена нельга разглядаць без уліку шматлікіх лакальных асаблівасцяў.

ЛІТАРАТУРА

1. Аўсейчык, У. Я. Рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты ў каляндарнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння (па матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У. Я. Аўсейчык // Асоба

збіральніка ў захав. нематэрыяльн. культ. спадчыны: 200-годдзя з дня нарадж. О. Кальберга: міжнар. кругл. стала; 25-26 чэрв. 2014 г., Мінск – Пінск/ Укл.Д. Алексеенка і Ю. Пацюпа; Цэнтр даследвання бел. культуры, мовы і літр. НАН Беларусі, Музей Бел. Палесся (г. Пінск), Маршалкоўская Управа Падляшскага ваяв. (Польшча), Польскі Інст. у Мінску. – Мінск, 2014. – С. 44-56.

2. Аўсейчык, У.Я. "Стаўроўскія дзяды" на Докшыччыне/ У.Я. Аўсейчык// Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік навуковых прац міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова (Полацк, 21 – 23 красавіка 2011 г.) : у 2 частках . / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; [пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача.]. - Наваполацк: ПДУ, 2011. - Ч.2. - С. 111-123.
3. Аўсейчык, У.Я. Восеньскія Дзяды ў беларусаў Падзвіння: рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты/ У.Я. Аўсейчык// Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А, гуманітарныя навукі.- Наваполацк, 2012. - № 9. - С. 35-44.
4. Аўсейчык, У.Я. Пахавальна-памінальная абраднасць вясковага беларускага насельніцтва Паддзвіння ў канцы XX–пачатку XXI стагоддзя/ У.Я. Аўсейчык// Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А, гуманітарныя навукі.- Наваполацк,: навукова-тэарэтычны часопіс. – 2010. – № 7. – С. 199–209.
5. Аўсейчык, У.Я. Традыцыі памінання продкаў у структуры масленічнай і вербнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння (па матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У.Я. Аўсейчык // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : мат. Міжнароднайнавук.-практ. канф. (20–21 лістапада 2014 г., г. Мінск) / уклад. Ю. В. Пацюпа; гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 327–330.
6. Варфаламеева, Т.Б. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне/ Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – Мінск: Беларускаянавука, 2004. – 910 с.
7. Кухаронак, Т.І. "Дзед касцей падавіўся": рэгіянальна-лакальная спецыфіка масленічнай гульні беларусаў Падзвіння/ Т.І. Кухаронак // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік навуковых прац міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова (Полацк, 21 – 23 красавіка 2011 г.) : у 2 частках . / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; [пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача.]. - Наваполацк : ПДУ, 2011. - Ч.2. - С. 158-161.
8. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка – Мінск: "Полымя", 1993 г. – с. 184.
9. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи… Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровкий. – Витебск: Губерн. Тип-литограф., 1897. – 338 с.
10. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.